Источник: “Настаўніцкая газета” – 2016-03-22

# “Пантэон беларускай асветы”: карыстайся ўласным розумам

Сярод праектаў, якія трапілі сёлета ў фінал Рэспубліканскага конкурсу “100 ідэй для Беларусі”, было няшмат маладзёжных ініцыятыў культуралагічнага кірунку. Некалькі тыдняў назад мы ўжо знаёмілі нашых чытачоў з цымбалісткай студэнткай магілёўскага філіяла Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Валерыяй Ільюшэнка, якая трапіла ў фінал конкурсу са сваім праектам крэатыўных цымбалаў, на якіх яна выконвае музыку самых розных сучасных маладзёжных плыняў — ад trance да R’n’B. Сёння знаёмім чытачоў яшчэ з адным культурніцкім праектам фіналістаў конкурсу “100 ідэй для Беларусі” — “Пантэон беларускай асветы (серыя навукова-папулярных фільмаў)”. Яго аўтары — два маладыя вучоныя з Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — малодшы супрацоўнік інстытута Надзея Ільюшэнка і старшыня Савета маладых вучоных гэтай установы Міхаіл Завадскі. Іх задума адначасова простая і складаная, іх матывы выразныя і празрыстыя, іх амбіцыі, здаецца, ураўнаважаны з іх магчымасцямі. Зрэшты, спытаем пра ўсё асабіста ў Надзеі Ільюшэнка і Міхаіла Завадскага.

— Надзея, Міхаіл, як узнікла ідэя такога праекта? І як знайшлі вы адно аднаго, як прыйшлі да супрацоўніцтва?

Надзея. Ідэя праекта нарадзілася не ўчора. Яна існуе ўжо некалькі гадоў, і першапачаткова я распрацоўвала яе разам з адной калегай з нашага інстытута, якая на сённяшні дзень тут ужо не працуе. Але, натуральна, кінавытворчасць, нават калі гаворка ідзе пра кароткаметражныя навукова-папулярныя фільмы, не можа быць справай аднаго чалавека. Патрэбна каманда. І першым чалавекам, які зацікавіўся гэтай справай, быў Міхаіл. Разам з ім мы сёння і думаем над тым, каб ідэя стварэння цыкла кароткаметражных фільмаў пад брэндавай назвай “Пантэон беларускай асветы” была рэалізавана ў канкрэтны прадукт. Безумоўна, мы бяром у разлік найперш тое, што сучасная культура візуальна арыентаваная, сёння фільмы пра гісторыю беларускай асветы, філасофіі хутчэй знойдуць свайго гледача, чым кнігі — свайго чытача.



Міхаіл. Мяне сапраўды захапіла гэтая ідэя — расказаць у цікавай, даступнай і ў той жа час няспрошчанай форме пра нашых асветнікаў на кінамове. Тым больш, як паказвае аналіз нашага сённяшняга рынку медыяпрадуктаў, такая ніша насамрэч ёсць. Так, раней ужо былі створаны дакументальныя фільмы, прысвечаныя асобным асветнікам — Ефрасінні Полацкай, Францыску Скарыне і інш. Дзейнасць некаторых нашых мысліцеляў, напрыклад, Ігната Дамейкі, разглядаецца ў шэрагу выпускаў вядомага тэлепраекта Белтэлерадыёкампаніі “Адваротны адлік”. Але такога, каб была створана цэлая канцэптуальная серыя фільмаў, прысвечаная гісторыі менавіта нашай інтэлектуальнай культуры, філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі, дагэтуль не было. І таму мы спадзяёмся, што цыкл фільмаў пра беларускіх асветнікаў мог бы стаць без перабольшання ўнікальнай з’явай.

— І ўсё-такі ў плане кінамовы, рэжысуры вы плануеце арыентавацца на якія-небудзь вядомыя ўзоры, напрыклад, тыя ж выпускі з “Адваротнага адліку” або дакументальныя фільмы Юрыя Цвяткова, Алега Лукашэвіча і інш.?

Надзея. Усе прыклады, якія вы толькі што згадалі, — гэта хоць і дакументальныя, але поўнаметражныя фільмы, працяглыя тэлеперадачы. У нас жа гаворка ідзе менавіта

пра кароткаметражныя фільмы, фактычна відэаролікі. І, безумоўна, падрабязна расказаць пра нашых герояў мы не зможам. Тым не менш засяродзіцца на нейкіх вельмі важных аспектах філасофіі таго ці іншага асветніка — з улікам менавіта адукацыйных мэт нашага праекта — цалкам магчыма. Адзін з семантычных модуляў у планах-праспектах сцэнарыяў фільмаў цыкла “Пантэон беларускай асветы” так і прапісаны: “Інтрыга — асноўны “нерв” філасофіі (светапогляду) героя, вакол якога разгортваюцца падзеі”.

— Калі ўжо зусім канкрэтна, колькі фільмаў вы плануеце ўключыць у серыю “Пантэон беларускай асветы” і якая будзе працягласць кожнай стужкі?
Міхаіл. Плануецца падрыхтоўка 25 відэаролікаў, кожны — працягласцю 8—10 хвілін. Ну, можа, 15… У залежнасці ад матэрыялу.

— Дарэчы, пра матэрыял. У буклеце, прадстаўленым на фінале конкурсу “100 ідэй для Беларусі”, вы пералічваеце цэлы шэраг асоб, якім збіраецеся прысвяціць свае фільмы. Калі глянуць на гэты пералік, то можна ўбачыць імёны як вельмі знакамітых фігур (Францыска Скарыны, Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага і г.д.), так і не вельмі вядомых (напрыклад, Андрэя Волана, Анёла Доўгірда, Антонія Скарульскага). Па якім прынцыпе адбіраліся персаналіі?

Міхаіл. Наогул, першапачатковая назва праекта гучала як “Вяртанне з забыцця”. Іншымі словамі, спачатку мы думалі звярнуць увагу ў першую чаргу на малавядомыя постаці, хаця яны і зрабілі вельмі істотны ўклад у развіццё не толькі беларускай, але і агульнаеўрапейскай культуры. Вы звярнулі ўвагу, напрыклад, на фігуру Анёла Доўгірда. Сапраўды, малавядомае ў нас імя… Але гэты філосаф у свой час палемізаваў з шэрагам мысліцеляў, выступаў з крытыкай ідэй самога Імануіла Канта, і тая палеміка істотна паўплывала на далейшае развіццё асветніцкай думкі ўсёй Еўропы. І нават сёння ў Інстытуце філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук штогод праводзіцца міжнародная канферэнцыя “Доўгірдаўскія чытанні”, названая ў гонар філосафа.

Надзея. А потым, шукаючы канцэпцыю ўсёй серыі фільмаў, мы ўсё-такі вырашылі ўключыць у спіс нашых герояў і вядомых асоб, так бы мовіць, упісаць невядомых у кантэкст вядомых, каб паказаць гісторыю філасофскай думкі Беларусі менавіта ў развіцці, у непарыўнасці і пераемнасці. Мы можам гэта зрабіць, бо нашымі вучонымі назапашаны багаты фактаграфічны матэрыял у галіне даследавання беларускай філасофскай, асветніцкай спадчыны. Згадаць хоць бы выдадзеную супрацоўнікамі Інстытута філасофіі НАН Беларусі капітальную шасцітомную працу “Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі”.

— Магчыма, наіўнае пытанне, і ўсё ж. Ці спадзеяцеся вы адкрыць або ўжо адкрылі нешта зусім новае з жыцця і дзейнасці, уласна самой філасофіі нашых асветнікаў? Можа быць, нават самыя сапраўдныя сенсацыі…

Надзея. Ну, каб ужо нейкія нечуваныя сенсацыі, — гэта наўрад ці. Але для шырокага кола гледачоў, мне здаецца, будзе нечаканым ужо сам гэты ракурс — менавіта на інтэлектуальную культуру, на мысленне, на філасофію.

Міхаіл. Ужо нават самі некаторыя асобы стануць для шырокай публікі адкрыццём, калі людзі даведаюцца, наколькі ўплывовым быў іх голас — інтэлектуальны, навуковы. У канчатковым выніку наша мэта — паспрыяць разуменню таго, наколькі Беларусь упісана ў гэтым сэнсе ў агульнаеўрапейскія традыцыі.

— Сляды навуковай і творчай дзейнасці, асабістага жыцця многіх вашых герояў трэба шукаць не столькі ў Беларусі, колькі за мяжой (у Польшчы, Расіі, Літве). Ці плануюцца выезды за мяжу падчас здымак?

Міхаіл. Такія выезды рэгулярна робяцца. І, безумоўна, мы разглядаем варыянты відэаздымкі за мяжой, скажам так, у месцах асаблівай канцэнтрацыі інтэлектуальнай

сілы таго ці іншага часу, напрыклад, у Віленскім універсітэце.
Надзея. Усё будзе залежаць ад фінансавання…

— Гэта, напэўна, і ёсць самае балючае пытанне ў сувязі з рэалізацыяй праекта?
Міхаіл. Мы разглядаем два фарматы работы. Першы — гэта такі поўны камплект магчымасцей: працягласць да 15 хвілін, добрая камп’ютарная графіка, задзейнічанне прафесійных акцёраў і аператара, выезды за мяжу і г.д. Адпаведна, гэта будзе азначаць адзін кошт. А другі варыянт больш сціплы: меншая працягласць фільмаў, прыцягненне да здымак студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якія б працавалі на аматарскіх пачатках, у якасці валанцёраў… І тут ужо быў бы іншы — значна меншы — кошт.

— Якой вы бачыце аўдыторыю вашых фільмаў?

Надзея. Безумоўна, гэта найперш моладзь — вучнёўская, студэнцкая. Таксама настаўнікі, выкладчыкі гуманітарных дысцыплін. Фільмы з серыі “Пантэон беларускай асветы” маглі б выкарыстоўвацца ў адукацыйным працэсе ў якасці дадатковага матэрыялу да лекцый, семінараў. Яны маглі б быць уключаны ў электронныя падручнікі па гісторыі культуры і думкі Беларусі. Без лішняга пафасу нам хочацца думаць, што серыя мае вялікі патэнцыял у плане фарміравання нацыянальнай самасвядомасці падрастаючага пакалення, захавання нацыянальнай гістарычнай памяці.

Міхаіл. Таксама мы прадумваем варыянты, каб распаўсюджваць фільмы “Пантэона беларускай асветы” праз інтэрнэт-платформы, сацыяльныя сеткі і г.д. Сюжэты фільмаў могуць быць перапрацаваныя для радыёпраграм. А яшчэ ёсць задума варыянта з перакладам на англійскую мову спецыяльна для замежнага гледача, каб гэтыя стужкі можна было дэманстраваць, напрыклад, на навуковых канферэнцыях з удзелам замежнікаў у якасці своеасаблівай рэкламы інтэлектуальнай спадчыны Беларусі.

— Надзея, Міхаіл, як (ці) перасякаецца гэты праект з тым, чым вы прафесійна займаецеся ў Інстытуце філасофіі?
Надзея. Ён перасякаецца наўпрост, бо тут, у інстытуце, мы з Міхаілам займаемся пытаннямі практычнай філасофіі, праблемай практызацыі філасофскіх ведаў. Як зрабіць так, каб філасофія магла выйсці з акадэмічнай аўдыторыі ці з філасофскіх кніг да шырокага грамадства, да звычайных людзей, якія, хоць і не чытаюць філасофскіх прац, але для іх таксама вельмі важныя пытанні пра сэнс жыцця, мэты жыцця і г.д.? І якраз наш праект — у нечым адказ на гэтае пытанне.

Міхаіл. Нядаўна разам з Надзеяй мы скончылі працаваць над праектам, прысвечаным існаванню філасофскіх ведаў у горадзе ў неакадэмічных неінстытуялізаваных формах. Тут ёсць праблема, тут ёсць відавочная дыстанцыя паміж прафесіяналамі-філосафамі і філосафамі з вуліцы, кабінетнымі вучонымі і людзьмі ў горадзе. Паміж першымі і другімі элементарна няма кантакту. Хаця на самай справе і філасофскія веды, і інтэлектуальная культура (культура крытычнага мыслення, крытычнага стаўлення да рэчаіснасці) — усё гэта запатрабавана самай шырокай аўдыторыяй.

— Напрыканцы, калі дазволіце, некалькі гэтакіх разняволеных, можа быць, нават дзіўнаватых пытанняў… Як вядома, грэчаскае слова “пантэон” перакладаецца як “храм усіх багоў”. Надзея, Міхаіл, а асобы, якім вы збіраецеся прысвяціць свае фільмы, для вас богі?

Надзея. Якое добрае пытанне! (Усміхаецца. — М.Ч.) Я не магу сказаць, што яны для мяне богі, але яны, напэўна, богі для гісторыі, культуры і асветы Беларусі. Асобы, пра якіх трэба ведаць. І не проста ведаць, а разумець тое, з чым яны звярталіся да людзей. І звяртацца ў сваю чаргу да іх.

Міхаіл. Безумоўна, пантэон беларускай асветы — гэта метафара. Мы не бралі такую шырокую тэму, як нацыянальныя героі Беларусі, хаця яна і вельмі запатрабаваная. Мы ўзялі больш вузкую тэму, у якой з’яўляемся спецыялістамі. Але гэтымі асобамі, героямі нашых будучых фільмаў, таксама можа ганарыцца кожны беларус.

— Цікава было б даведацца пра вашы асабістыя самыя вялікія прыхільнасці з шэрага выбраных вамі гістарычных постацей…
Міхаіл. Гэта Анёл Доўгірд, пра якога я ўжо згадваў. Казімір Нарбут, які напісаў грунтоўную працу па логіцы і здабыткі якога вельмі высока ацэнены еўрапейскімі вучонымі. Ігнат Абдзіраловіч, які заклаў асновы сучаснага культуралагічнага разумення Беларусі. Ну, і, безумоўна, Францыск Скарына. Ён як светач.

Надзея. А ў маім выпадку гэта Казімір Лышчынскі, які зрабіў вялікі ўклад у развіццё філасофіі і паплаціўся нават жыццём за свае погляды. Адам Міцкевіч — пра яго наогул можна гаварыць вельмі і вельмі доўга, блукаючы па яго беларускіх, польскіх, літоўскіх, нават французскіх слядах. І — я тут цалкам пагаджуся з Міхаілам — Ігнат Абдзіраловіч, які, з аднаго боку, падсумаваў, а з другога боку, пачаў новую старонку беларускага мыслення.

— Самае апошняе. Калі гэта можна, калі ласка, выкажыце лаканічна асноўную формулу (думку, пастулат) філасофіі беларускіх асветнікаў. Ці, напрыклад, некалькі такіх тэз.

Надзея. Так з ходу было б занадта прэтэнцыёзна выводзіць нейкую квінтэсэнцыю калектыўнай думкі ўсіх гэтых людзей, бо яны жылі ў розны час, думалі пра розныя рэчы… Мне здаецца, гэта тэма асобнай гутаркі.

Міхаіл. А я ўсё ж рызыкну. На мой погляд, у якасці аднаго з пастулатаў беларускія асветнікі прызнаюць… (Задумваецца. — М.Ч.) Фактычна, яны рэалізоўваюць у сваіх працах знакаміты дэвіз Іммануіла Канта, які заключаецца ў наступным: карыстайся ўласным розумам, карыстайся ўласным мысленнем, крытыкуй тое, што табе гавораць, правярай, удакладняй, абгрунтоўвай, але самастойна даходзь да тых высноў, якія прапаноўвае табе грамадства!

## Каментарый калегі

Вера Белакрылава, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выконваючая абавязкі вучонага сакратара ўстановы: “Задача фарміравання нацыянальнай самасвядомасці сёння па-ранейшаму актуальная. Яе фарміруюць з розных элементаў, яе ствараюць, як мазаіку, яе збіраюць, як пазл. І ўжо, так бы мовіць, па факце ў нацыянальнай самасвядомасці прысутнічаюць народныя традыцыі, абрады, песні, танцы і г.д. Гэта такі стэрэатып у шырокай масавай свядомасці. Пры гэтым часта не ўлічваецца, забываецца інтэлектуальны, інтэлігенцкі складнік. Тое, што ў нас здаўна былі не толькі песні і танцы вясковыя. У нас было і іншае — высокі інтэлектуальны прадукт. Вось гэты прабел якраз і запаўняюць аўтары праекта “Пантэон беларускай асветы”.

Мікола Чэмер